# ТЭОРЫЯ І ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ

УДК 316.736:130.12-053.81(476)

*В. Р. ЯЗЫКОВІЧ*

## СУЧАСНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ ІНКУЛЬТУРАЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ МОЛАДЗІ

*Артыкул прысвечаны вынікам вывучэння працэсу інкультурацыі моладзі ў духоўнай культуры сучаснай Беларусі. На падставе сацыялагічных даследаванняў аналізуюцца тэндэнцыі далучэння да духоўнай культуры, рэлігійных і іншых каштоўнасцей студэнцкай моладзі краіны. На прыкладзе студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў вызначаецца станоўчы характар адносін студэнцкай моладзі да нацыянальнай культуры і беларускай мовы. Выяўляюцца магчымасці забеспячэння эфектыўнай інкультурацыі асобы сродкамі дзейнасці культурна-асветных установ.*

Адным з актуальных кірункаў культуралагічных даследаванняў з'яўляецца вывучэнне працэсу інкультурацыі асобы ў духоўнай культуры сучаснай Беларусі. У кантэксце работы над тэмай «Даследаваць працэсы інкультурацыі асобы ў духоўнай культуры сучаснай Беларусі» (па заданні Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь) намі вывучаўся працэс інкультурацыі беларускай моладзі, яе далучэнне да духоўнай культуры, маральных, эстэтычных, рэлігійных і іншых каштоўнасцей.

У 2012 г. было праведзена даследаванне рэлігійнай ідэнтычнасці студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

Вынікі даследавання дазваляюць нам выкласці наступныя даныя. Абсалютная большасць рэспандэнтаў ацаніла рэлігію як адносна важны бок свайго жыцця. Пры гэтым значная колькасць вызначылася як «проста вернікі». Толькі 8% апытаных студэнтаў абвясцілі сябе членамі царквы, абшчыны. Рэгулярна прымаюць удзел у выкананні рэлігійных рытуалаў каля 11% рэспандэнтаў. Большасць аддаюць перавагу індывідуальным вымярэнням рэлігійнага жыцця, не з'яўляюцца сістэматычнымі ўдзельнікамі інстытуцыйных структур рэлігійных аб'яднанняў. Характэрным з'яўляецца праяўленне рэлігійнай талерантнасці, аднолькавага памяркоўнага стаўлення да ўсіх рэлігій.

На пытанне аб канфесіянальнай ідэнтычнасці былі атрыманы наступныя адказы рэспандэнтаў: «Я праваслаўны» – 75%; «Я каталік» – 11,5%; «Я цікаўлюся класічнымі вучэннямі Усходу (будызм, даасізм, індуізм, сінтаізм і інш.)» – 4,5%; «Я з'яўляюся прыхільнікам язычніцкіх традыцый» –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4%; «Я пратэстант» – 2,5%; «Я іўдзей» – 1,5%. Як бачна, найбольш распаўсюджана сярод рэспандэнтаў праваслаўная ідэнтычнасць. Адзначаецца прыкметны ўплыў каталіцкай царквы. Адносна невысокімі з'яўляюцца паказчыкі пратэстанцкай ідэнтычнасці і прыналежнасць да іўдаізму. У апытанні не зафіксавана мусульманская ідэнтычнасць. Ні адзін са студэнтаў не пазначыў сваю цікавасць да новых рэлігійных рухаў. Дадзеныя вынікі дазваляюць сцвярджаць, што мода на ўдзел у маргінальных рэлігійных рухах у студэнцкім асяроддзі прайшла.

Паводле ацэнкі рэспандэнтаў, на фарміраванне іх рэлігійных перакананняў у большай ступені паўплывалі бацькі. Цікавым падаецца высокі паказчык спасылкі на жыццёвы вопыт як выток фарміравання рэлігійных уяўленняў (30%). Фіксуецца некаторы ўплыў на ўсталяванне рэлігійных перакананняў з боку сацыяльнага асяроддзя, агульнаадукацыйнай школы і каледжа.

Неабходнасць і карыснасць рэлігійнага выхавання і адукацыі прызнаюцца большасцю рэспандэнтаў. Многія аддаюць сям'і вызначальную ролю ў пытаннях рэлігійнага выхавання і адукацыі. Істотная частка рэспандэнтаў палічыла важным ажыццяўленне рэлігійнага выхавання ў свецкіх навучальных установах (агульнаадукацыйнай школе, каледжы, універсітэце).

Большасць апытаных ацанілі аднаўленне істотнага ўплыву рэлігіі ў сучасным свеце як заканамерную тэндэнцыю, якая спрыяльна паўплывае на будучыню чалавецтва. Разам з тым значная колькасць рэспандэнтаў адзначыла рэнавацыю ўплыву рэлігіі як модную тэндэнцыю, якая можа спыніцца. Чацвёртая частка назвала адраджэнне рэлігійна-царкоўнага жыцця ў Беларусі як вельмі важную і спрыяльную тэндэнцыю. Большасць лічыць, што «аднаўленне рэлігійна-царкоўнага жыцця ў Рэспубліцы Беларусь у некаторай ступені спрыяльна».

У студэнцкім асяроддзі дамінуе станоўчая ацэнка ўплыву рэлігійных традыцый на развіццё культуры. Большасць рэспандэнтаў прытрымліваюцца пазітыўнай ацэнкі ролі рэлігіі. Пятая частка рэспандэнтаў адказалі, што «менавіта рэлігія стварае культурны пачатак у жыцці чалавека і грамадства». Больш за палову апытаных студэнтаў адзначылі рэлігійна-царкоўныя традыцыі як істотны кампанент нацыянальнай беларускай культуры.

Значная частка рэспандэнтаў згодна з тым, што ў Рэспубліцы Беларусь забяспечваецца рэальная свабода сумлення і веравызнання, яе грамадзяне маюць сапраўдныя магчымасці ў асноўным ці ў поўнай меры задавальняць духоўныя запыты і патрэбы.

Вынікі даследавання паказалі, што ў жыццё беларускай студэнцкай моладзі прыходзяць і ў пэўнай ступені ўкараняюцца такія асноўныя праявы рэлігійнага жыцця, як малітва і рытуальная практыка. Больш за трэць рэспандэнтаў адзначылі, што моляцца вельмі часта, але палова – даволі рэдка. Акрамя таго, высветлілася адносна невысокая ступень уключанасці студэнтаў у літургічнае жыццё рэлігійных абшчын. Пастаянна ўдзельнічае ў здзяйсненні рэлігійных рытуалаў 11,5% рэспандэнтаў. Больш за трэць апытаных адказалі, што здзяйсненне рэлігійных рытуалаў выклікае ў іх



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адчуванне сувязі з Богам, Вышэйшым светам, але прыкладна такая ж колькасць зазначыла, што для іх рэлігійныя рытуалы носяць хутчэй фармальны характар.

Даныя даследавання пацвярджаюць, што студэнцкая моладзь Беларусі з вялікай цікавасцю ставіцца да гістарычна традыцыйных рэлігійных напрамкаў, цэркваў і канфесій. Больш важкай становіцца рэлігійна-канфесіянальная ідэнтычнасць. У духоўным жыцці маладых беларусаў актуалізуецца патэрналісцкая тэндэнцыя, выяўляецца імкненне кіравацца традыцыйнай сістэмай каштоўнасцей (у першую чаргу праваслаўя). Прасочваецца некаторая дынаміка ўключэння студэнтаў у літургічнае жыццё рэлігійных суполак і парафій. Важна, каб моладзь Беларусі мела магчымасць знаёміцца з сучаснымі тэндэнцыямі і формамі развіцця рэлігійнай культуры, з творчасцю багасловаў, пісьменнікаў, паэтаў, кампазітараў, мастакоў і інш.

У кантэксце вывучэння працэсу інкультурацыі даследаваліся адносіны студэнцкай моладзі да нацыянальнай культуры і беларускай мовы. Высветлілася, што студэнты аддаюць перавагу нацыянальнай (адказ «Я – беларус/беларуска» выбралі 35% рэспандэнтаў) і гендарнай (адказ «Я – малады чалавек/дзяўчына» абралі таксама 35% рэспандэнтаў) формам ідэнтычнасці.

Стаўленне да беларускай культуры як найбольш значнай для сябе выказалі 39,5% рэспандэнтаў. Большая частка апытаных падкрэсліла значнасць беларускай культуры, але для сябе асабіста вызначыла яе каштоўнасці як адносна важныя. Нязначная колькасць рэспандэнтаў зазначыла, што не надае вялікага значэння беларускай культуры і яе каштоўнасцям, альбо спаслалася на касмапалітычнасць сучаснага жыцця і неістотнасць нацыянальных вымярэнняў культуры.

Большасць рэспандэнтаў сцвярджаюць, што як асобы яны ў значнай ступені сфарміраваліся пад уплывам беларускай культуры, а некаторыя лічаць, што цалкам сфарміраваліся пад базавым уплывам беларускай культуры. Разам з тым больш за трэць рэспандэнтаў адзначылі нязначнае ўздзеянне беларускай культуры на фарміраванне іх асобы.

Сярод фактараў, якія ў найбольшай ступені садзейнічалі далучэнню да беларускай культуры, апытаныя падкрэслілі ўплыў школы, каледжа, універсітэта, змест чытання, уцягнутасць у працу самадзейных аб'яднанняў і творчых калектываў, уплыў бацькоў, сацыяльнага асяроддзя, сяброў, характар прафесійных зносін, у невялікай ступені ўздзеянне сацыяльных сетак.

Рэспандэнты адзначылі, што на фарміраванне іх прыхільнасці да нацыянальнай культуры ў найбольшай ступені паўплывалі чытанне беларускай літаратуры, захапленне беларускім фальклорам, народнай культурай, нацыянальным выяўленчым, музычным і тэатральным мастацтвам, сістэмай каштоўнасцей і нацыянальным характарам беларускага народа, вучоба ў беларускай школе. Толькі нязначная частка рэспандэнтаў спаслалася на ўплыў хатняй, сямейнай атмасферы як на важны фактар фарміравання цікавасці да нацыянальнай культуры. Кожны пяты паставіў на першае месца ўплыў беларускамоўнага асяроддзя.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пэўная частка рэспандэнтаў выказала актыўную пазіцыю, адзначыўшы, што не толькі цікавіцца культурным жыццём Беларусі і беларускай дыяспары, але і імкнецца браць актыўны ўдзел у культурным жыцці краіны, універсітэта. Пятая частка студэнтаў адказала, што актыўна шукае інфармацыю аб культурным жыцці Беларусі.

Адказваючы на пытанне, чым вызначаецца ўнікальнасць і каштоўнасць нацыянальнай беларускай культуры, кожны чацвёрты рэспандэнт звярнуў увагу на традыцыйную культуру беларусаў, кожны пяты падкрэсліў непаўторныя рысы нацыянальнага характару і значэнне помнікаў беларускай гісторыі і культуры. Частка апытаных адзначыла творчыя дасягненні беларускай літаратуры і прафесійнага мастацтва.

З ліку беларускіх пісьменнікаў рэспандэнтамі ў найбольшай ступені цэніцца творчасць В. Быкава, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, У. Караткевіча, І. Шамякіна, І. Мележа, М. Танка, Р. Барадуліна, Ф. Багушэвіча, К. Чорнага, К. Крапівы, Н. Гілевіча, П. Броўкі, Я. Янішчыц, А. Сыса. З ліку беларускіх кампазітараў, выканаўцаў, дзеячаў музычнай культуры выклікаюць цікавасць творчасць У. Мулявіна і ансамбля «Песняры», І. Лучанка, Я. Глебава, ВІА «Ляпіс Трубяцкой», М. К. Агінскага, Д. Смольскага, ВІА «Сябры», ВІА «Без білета», У. Алоўнікава, Н. Сакалоўскага, Э. Ханка, А. Фляркоўскага, Л. Захлеўнага, С. Картэса, Г. Гарэлавай, К. Камоцкай і інш. Паводле даных апытання, сярод беларускіх мастакоў, скульптараў, архітэктараў у большай ступені рэспандэнтамі цэніцца творчасць М. Шагала, М. Савіцкага, З. Азгура, К. Малевіча, Н. Орды, І. Хруцкага, Я. Драздовіча, У. Жбанава і інш.

Як тыповыя і вызначальныя рысы нацыянальнага характару беларусаў рэспандэнты назвалі талерантнасць, працавітасць, давер, дабрыню, неканфліктнасць, значнасць сямейных каштоўнасцей.

У якасці важных мер па дзяржаўнай падтрымцы развіцця і мадэрнізацыі беларускай культуры апытаныя адзначылі істотнае фінансаванне праграм па захаванні і развіцці беларускай народнай культуры, падтрымку беларускай літаратуры і прафесійнага мастацтва, актыўнае пазіцыянаванне спрыяльнага вобраза Беларусі і яе культуры ў глабальным кантэксце, далейшае развіццё прафесійнай адукацыі ў сферы культуры, больш глыбокае даследаванне гісторыі і тэндэнцый сучаснага развіцця.

На пытанне, як часта і ў якіх абставінах Вы гаворыце па-беларуску, большая частка рэспандэнтаў адказала, што робіць гэта часам, па неабходнасці. Малая частка, як правіла, гаворыць па-беларуску, і 2% заўсёды імкнуцца размаўляць па-беларуску. Амаль трэцяя частка рэспандэнтаў вельмі рэдка гаворыць па-беларуску. Пры гэтым палова лічыць: ім патрэбна лепшае веданне беларускай мовы. Кожны пяты рэспандэнт сцвярджае, што яму неабходна ўдасканальваць валоданне беларускай мовай, але кожны сёмы адзначае, што не мае часу і жадання для гэтага. Большасць рэспандэнтаў вызначаюць важнасць пераходу да зносін з сябрамі і роднымі на беларускай мове. Кожны чацвёрты ўказвае на неабходнасць выкарыстання літаратурнай формы беларускай мовы ў СМІ. Кожны пяты падкрэсліў значэнне выкладання на беларускай мове.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКіМ

Большая частка рэспандэнтаў лічыць важным вучыць сваіх дзяцей беларускай мове і культуры разам з іншымі напрамкамі навучання, кожны трэці адзначыў, што беларуская мова і культура неабходны для фарміравання асобы іх дзяцей. Разам з тым некаторая частка апытаных лічыць веданне англійскай мовы сёння больш актуальным, чым беларускай. Большасць рэспандэнтаў сцвярджаюць, што прадметы, звязаныя з засваеннем беларускай мовы і культуры, павінны быць належна пададзены ў адукацыйных праграмах дашкольных устаноў, сярэдняй і вышэйшай школы, а кожны чацвёрты назваў аптымальным навучанне ў беларускамоўнай школе. Акрамя таго, кожны дзясяты адказаў, што дастаткова факультатыўнага навучання дзяцей беларускай мове і культуры.

Як выклікаючыя істотную цікавасць былі вылучаны англійская, італьянская, польская, расійская, французская, нямецкая, індыйская, кітайская, японская, украінская культура, культура ЗША, Скандынаўскіх краін, краін Лацінскай Амерыкі, літоўская культура і інш. Да ліку найбольш цікавых дысцыплін па выбары, звязаных з засваеннем нацыянальнай і замежных культур, рэспандэнты аднеслі такія, як «Краязнаўства (замежныя краіны)», «Культура сучаснай Беларусі», «Культура Вялікабрытаніі», «Культура ЗША», «Мультыкультурнасць сучаснай Беларусі», «Культура Францыі», «Культура краін блізкага замежжа», «Культура беларускага замежжа».

Вынікі даследавання дазваляюць намеціць напрамкі дзейнасці па забеспячэнні прадуктыўнай інкультурацыі асобы ў кантэксце сучасных тэндэнцый абнаўлення духоўнай культуры беларускага грамадства.

Вельмі важна, каб дзейнасць устаноў культуры была накіравана на развіццё цікавасці моладзі да гісторыі і сучаснага культурнага жыцця Беларусі, пашыралася сфера выкарыстання беларускай мовы. Вывучэнне прыярытэтных форм ідэнтычнасці, уласцівых беларускай моладзі, паказвае, што яна аддае перавагу нацыянальным формам. Стаўленне да беларускай культуры як асобасна значнай уласціва большасці маладых беларусаў. Праведзеныя даследаванні сведчаць, што вырашальным для развіцця цікавасці да нацыянальнай культуры выступае ўплыў школы, каледжа і ўніверсітэта, змест чытання, уцягнутасць у працу самадзейных аб’яднанняў і творчых калектываў.

У нашай краіне створаны неабходны сацыякультурны кантэкст фарміравання пазітыўнага стаўлення да хрысціянскіх традыцый і іншых гістарычна традыцыйных для Беларусі канфесій. Сёння ў рэспубліцы вырасла пакаленне, якое пазітыўна ўспрымае рэлігійныя традыцыі і выхоўвае ў дзяцей паважлівае стаўленне да царквы і духоўных каштоўнасцей, фарміруе ў працэсе інкультурацыі праваслаўную, каталіцкую і іншыя формы рэлігійнай ідэнтычнасці. Спецыяльных намаганняў з боку ўстаноў культуры па стварэнні пазітыўнага вобраза хрысціянскіх і іншых традыцыйных канфесій не патрабуецца. Важна развіваць розныя формы супрацоўніцтва ўстаноў культуры з Праваслаўнай, Рымска-каталіцкай і іншымі хрысціянскімі цэрквамі, гістарычна традыцыйнымі канфесіямі.

Адна з праблем інкультурацыі асобы ў духоўнай культуры сучаснай Беларусі заключаецца ў тым, што сістэма адукацыі сёння будуецца без акцэнту на мастацка-эстэтычныя і культуратворчыя аспекты асобаснага раз-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

віцця. Сітуацыя непаўнаты магчымасцей раскрыцця мастацка-творчага патэнцыялу асобы ў некаторай ступені пераадольваецца за кошт дзейнасці ўстаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі (дзіцячых школ мастацтваў, цэнтраў эстэтычнага выхавання і інш.). Функцыянаванне ўстаноў дадатковай адукацыі дапамагае ўхіліць недахопы сістэмы агульнай сярэдняй адукацыі, рэалізуючы мала запатрабаваныя ў школе здольнасці да культурна- і мастацка-эстэтычных відаў дзейнасці. Жыццёва неабходна, каб беларуская сістэма адукацыі давала магчымасць сістэматычнага засваення ведаў аб айчыннай і сусветнай культурнай спадчыне і сучасным стане развіцця культуры, што забяспечыць вяртанне ў праграму агульнаадукацыйнай школы інтэграваных вучэбных дысцыплін «Мастацтва» і «Сусветная мастацкая культура». Акцэнтамі сістэмы адукацыі таксама павінны стаць развіццё навыкаў асобаснага ўспрымання каштоўнасцей культуры, фарміраванне талерантнага стаўлення да іншых культур.

Значны патэнцыял уздзеяння на працэсы інкультурацыі асобы маецца ў сродках масавай інфармацыі. Аднак праграмы мастацка-эстэтычнай і культуралагічнай накіраванасці займаюць нязначнае месца ў агульным інфармацыйным полі. Неабходна садзейнічаць павелічэнню долі матэрыялаў культуралагічнай і мастацка-эстэтычнай накіраванасці ў інфармацыйных патоках краіны, ствараць узоры сацыяльнай рэкламы, якія прапагандуюць культурныя дасягненні беларускага народа, творчасць выдатных дзеячаў беларускай культуры, актыўна іх выкарыстоўваць. Важным напрамкам з'яўляецца стварэнне пазнавальных праграм, якія асвятляюць гісторыю і культуру беларусаў і іншых этнакультурных груп, адлюстроўваюць мультыкультурную сітуацыю беларускага грамадства, пазітыўныя формы ўзаемаадносін сацыяльных і гендарных груп, прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей і канфесій.

Істотным рэсурсам эфектыўнай інкультурацыі падаецца культурна-адпачынкавая дзейнасць, здольная забяспечыць пэўныя аспекты асобаснага развіцця. Установы культуры павінны пашыраць культурную і мастацка-эстэтычную прастору асобы, спрыяць далучэнню моладзі да традыцый нацыянальнай культуры, развіваць устойлівую цікавасць да народнай культуры Беларусі, уцягваць моладзь у творчыя формы сацыяльна-культурнай дзейнасці, розныя віды мастацкай самадзейнасці. Прасоўванне дасягненняў беларускай культуры можна актывізаваць, выкарыстоўваючы такія сучасныя формы, як літаратурна-мастацкія аўкцыёны, творчыя рынгі, відэаканферэнцыі, буккросінг, флэш-моб і інш.

У сучасным глабальным свеце нацыянальныя культуры знаходзяцца ў няпростай сітуацыі, іх каштоўнасці размываюцца пад уздзеяннем універсалісцкіх тэндэнцый. Забеспячэнне прадуктыўных форм і тэндэнцый інкультурацыі моладзі дазволіць беларускай культуры быць канкурэнтаздольнай у сусветным спаборніцтве культур, паўстаць у выразным выглядзе і выклікаць цікавасць да сябе на міжнароднай арэне.

*V. YAZYKOVICH*

## MODERN TRENDS OF THE BELARUSIAN YOUTH'S ENCULTURATION

*The article is devoted to the results of the study of the youth's enculturation process in the spiritual culture of modern Belarus. Tendencies of initiation to*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*the spiritual culture, religious and other values of the Belarusian students on the basis of case studies are analyzed. Positive attitude to the national culture and the Belarusian language is revealed on the example of the students of the Belarusian State University of Culture and Arts. The opportunities of the effective person's enculturation by means of activities of cultural and educational institutions are determined.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 15.09.2013.

УДК 130.2+930.85(47+57)"19"

*В. М. МИХЕЕВ*

## КУЛЬТУРОЛОГИЯ К. Н. ЛЕОНТЬЕВА: ТРИЕДИНАЯ ФОРМУЛА РАЗВИТИЯ

*Статья посвящена анализу теоретического наследия русского культуролога второй половины XIX в. К. Н. Леонтьева и его вклада в социально-философскую мысль России.*



Константин Николаевич Леонтьев (1831–1891) является одним из выдающихся мыслителей русской социальной философии, представители которой (Хомяков, братья Киреевские и Аксаковы, Самарин, Данилевский, Страхов) пытались сформулировать свое, русское мировоззрение, определить провиденциальный смысл русской истории и русского народа. Эту же тему разрабатывали почвенники (Ап. Григорьев, Ф. Достоевский), государственники (М. Катков, Л. Тихомиров, Н. Дебольский, П. Астафьев, Н. Бердяев), евразийцы от Трубецкого до Гумилева. Если в конце XIX в. теоретические взгляды К. Н. Леонтьева не пользовались широкой известностью и популярностью («…при жизни интересовались, пожалуй, лишь несколько десятков приверженцев» [2, с. 4]), то уже в конце XX и начале XXI в. труды мыслителя начинают переиздавать, интерес к нему все более возрастает, увеличивается количество защищенных диссертаций. Однако по-прежнему в отдельных работах исследователей ощущается непонимание его основных идей, происходит «осовременивание» или, наоборот, «привязывание» их только к прошлому, «тяготение» к негативным штампам и клише

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ